

Перагарнуўшы гэту старонку, чытач вельмі здзівіцца, пагартаўшы далей, здзівіцца яшчэ болей: сем часопісаў у адным — ці не жарт гэта? А гэта мы такім вось арыгінальным чынам віншуем чытача з днём нараджэння выдання — і дорым сем дайджэстаў: за 1950-я, 1960-я, 1970-я і гэтак далей.

Калі сур'ёзна, то перад чытачом разгорнецца сем папяровых экскурсій, для падрыхтоўкі якіх нам давялося пагрузіцца ў былыя дзесяцігоддзі, — перачытаць часопісы за ўсе гады, уразіцца і зрабіць высновы, а таксама выцягнуць, так бы мовіць, на свет новы тое, што варта перачытаць.

Наколькі цікавымі вам пададуцца экскурсіі? А вы прачытайце — і напішыце нам.

«М»ы

На другой і чацвёртай старонках вокладкі фота Кастуся Дробава.

Часопіс «Маладосць» выказвае падзяку
Дзяржаўнаму літаратурна-мемарыяльнаму музею Якуба Коласа.